Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 30 Вільня, Нядзеля 9 Лістапада 1930 г. Год VI (XIV)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:	„Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год—6 зл., на паўгода —	Цана абвестак:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)	3 зл., на 3 месяцы — 2 зл..	на 1-шай старонцы 60 гр., 2 і 3 — 50 гр., на 4-ай —
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. да 4 гадз. веч.	ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.	40 грш. — за радок дробнага друку ў адной шпальце

Усе Беларусы галасуюць 16-га і 23 лістапада толькі за № 11

Беларусы і выбары.

Выбарная праца ў польсхі Сойм і Сэнат у поўным ходзе. Як заўсёды, так і гэтым разам, па ўсіх сьцежках і гасьцінцах, пляцох і рынках поўна рожных агітатараў, захваляючых пад неба кожны сваю праграму, сваю партыю; „рай зямны“ абяцаюць тым, хто ім павера і будзе галасаваць на падсунены нумар Гэтак уся выбарная справа пераварочываецца «ўверх дном».

На руку гэта розным панскім прыблудам, але згуба пэўная для нашага беларускага селяніна. Дык дзе праўда? Як і за кім галасавапь у набліжаючыхся выбарах 16-га і 23-га лістапада? Адказ адзін:

Усе сьведамыя Беларусы будуць пры гэтых выбарах галасаваць **за сьпісак Беларуска-Украінскага Выбарнага Блёку**, які мае **№ 11**. Чаму не за іншы?

На гэтыя выбары пайшлі Беларусы расьцярушаны аж на чатыры групы. Некалі сільная, сягоньня разьбітая група беларускіх радыкалаў з-пад знаку б. Бел. Сял.-Работн. Грамады у гэтых выбарах так прыцісьнена сучаснымі палітычнымі абставінамі, што спадзявацца якіх небудзь пазытыўных для яе вынікаў сусім ня прыходзіцца. Не адно можна было-б аб гэтых людзях сказаць, але «ляжачага ня б'юць»...

Дальшай групай, прабуючай шчасьця, ёсьць беларуская «санацыя» з Астроўскім, Луцкевічам і нова-прыпрэжаным Акінчыцам на чале. Гэта група мае № 22 і па сваёй «ідэолёгіі» зьяўляецца вернай насьледніцай бясслаўных Аляксюкоў і Паўлюкевічаў, Вярнікоўскіх і Умястоўскіх і мусіць падзяліць іхны-ж бясслаўны правал.

Гэта група, ня маючая ніякай апоры сярод сялянства, на выбары ўбралася ў новыя пёры: склеціла адумысловую Выбарную „шопку“, шумна назваўшы яе беларускім «Цэнтрасаюзам». Гэта аднак не паможа. Пер'е лішне выразна маляванае і ніхто з здарова-думаючых Беларусаў на гэты сьпісак новых полёнофілаў свайго голасу даць ня можа.

Трэцяй з чаргі групай ёсьць «модныя радыкалы» з сьпіскам № 24. Як з ідэолёгічнай групай лічыцца з ёю нельга. Гэта проста «Гандлёвая супалка з агранічанай (да мініма!) адказнасьцю дзеля эксплёатацыі пасольскіх мандатаў». Нічога больш! Уваходзяць сюды два бyўшыя паслы: Альб. Стэповіч і К. Юхневіч, якія за сваю бяздзейнасьць у часе прошлага пасланьня страцілі ўсякі давер беларускага арганізованага грамадзянства, а тым самым і права да паноўнага кандыдаваньня ў гэтых выбарах.

Калі Выбарны К-тэт Украінска-Беларускага Блёку, прымаючы вышэйсказанае пад увагу, адмовіў ім права кандыдаваньня ў гэтых выбарах, дык названыя б. паслы парашылі, што будзе выгадней для іх-жа зламаць агульны фронт і падаць свой асобны сьпісак. Гэтак і зрабілі.

У час пазнаўся на гэтых людзях К-т Бел.-Укр. Блёку, пазнаюцца на іх хіба і выбаршчыкі і ніхто, апрача хіба радні, за сьпісак № 24 галасаваць ня будзе.

Чацьвертай урэшце групай беларускай у Сьвянцяншчыне ёсьць **Бел.-Укр. Выбарны Блёк** з сьпіскам **№ 11**. Гэты сьпісак згрупаваў каля сябе ўсё незалежна думаючае і ніколі на бакі ня хістаючаеся беларускае грамадзянства. Ідэовы кірунак ягоны заручаюць такія партыі, як Бел. Хрысьціянская Дэмократыя, Сялянскі Саюз, Бел. Праваслаўнае Дэмократычнае Аб'яднаньне, што не зважаючы на ніякія труднасьці, ніколі не нахіляліся пад цяжарам дня.

Ясна, што галасаваць Беларусы за іх будуць і павінны.

За каго галасаваць?

Сапраўдная паводка найрозьнейшых сьпіскаў заліла нашу старонку. Кожны хоча ўзяць верх, кожны хоча правясьці сваіх аднадумцаў. Было-б дзеля гэтага для нас беларусаў сорамна, каб нашымі галасамі ды прайшлі ў Сойм ці Сэнат розныя паны, асаднікі ды іхныя прыхвосьнікі. Але-ж як пазнацца тут, хто свой, а хто проста чужы, ці сваім толькі прытвараецца?

Побач з беларускімі сьпіскамі у вакругох Сьвянцянскім, Віленскім і Наваградзкім ёсьць і сьпіскі польскія: урадавы „ББ.“ № 1, апазыцыйныя №№ 4, 7 і іншыя. Гэтыя польскія сьпіскі (іх ёсьць яшчэ і больш), асабліва №№ 1 і 7 небясьпечны тым, што падшываюцца пад беларускасьць, называючы нават сябе Беларусамі(!), гаворачы ламанай беларушчынай і раздаючы адозвы пісаныя таксама пабеларуску. Пазнаць іх можна па нумарох. Дзеля гэтага нельга галасаваць за №№ 1, 4, 7 і інш., бо людзі стаячыя за імі сьведама ці нясьведама (напр. Шапель з № 7) цягнуць на нашы землі разам з польшчынай хмары чужых асаднікаў і іх падтрымліваюць.

Нельга галасаваць за беларускую „санацыю“ з № 22, бо гэта таксама людзі аддаўшыяся на чужыя ўслугі, насьледнікі Аляксюка, Вярвікоўскага і кумпаніі; служаць тым, „хто больш дасьць“: сяньня — польскім паном. Словам — куды вецер дуе. З гэткімі людзьмі нам не па дарозе.

Нельга галасаваць і за „Незалежных Радыкалаў“ А. Стэповіча і Юхневіча з—№24, бо гэта звычайная выбарная крамка. Як не ўтаргуюць цяпер, уціхаміравца і вернуцца туды, скуль у свой час прышлі: там шкоднымі прынамся ня будуць, а калі фаху свайго не забыліся і працаваць захочаць, дык могуць быць і карыснымі.

Усім трэба галасаваць за сьпісак № 11, бо выстаўляюць яго людзі, якія заўсяды былі, ёсьць і будуць вернымі абаронцамі свайго народу. Перадавымі кандыдатамі гэтага сьпіску выстаўлены: асыстэнт унівэрсытэцкай клінікі Д-р мэд. Ст. Грынкевіч, інж.-аграном Ад. Клімовіч, сэнатар В. Багдановіч, сэнатар В. Рагуля, пасол Ф. Ярэміч, Ф. Цікота.

Сучасныя выбары засталі Беларусаў (Бел. Укр. Выбарны Блёк) пры поўным безграшоўі. Таму незашта прадстаўніком нашым даехаць на вёску, каб асабіста на мейсцы ўсё як трэба растлумачыць, завязьці патрэбныя нумары да галасаваньня і г. д. Аб мітынгах беларускіх пры сяньняшніх варунках і падумаць нельга. Адзіным злучвом беларускіх выбаршчыкаў у гэтых выбарах ёсьць сапраўды беларускае друкаванае слова: „Беларуская Крыніца“ і „Беларускі Кліч“. Таму вынікі гэтых выбараў залежаць усёцэла ад грамадзкай сьпеласьці беларускага грамадзянства, прадусім чытачоў нашых газэт. Вас, грамадзяне, клічам і Вам верым: да каго з Вас трапіць наша газэта, прачытайце яе самі, суседзям растлумачце і як найхутчэй далей ў сьвет пусьціце; хай іншых усьведамляе, каб паказаць, што беларуская вёска ўжо дасьпела і ведае, каго і зашто выбірае.

Хто знае, хай растлумачыць нязнаючаму справу выбараў: калі хто ня мае друкаванага № 11 — мы яго давязьці ўсюды ня можам, — хай на чыстай белай паперы напіша сам адзінаццатку (бяз рыскаў, пунктаў і іншых знакоў—бо будзе няважнай!) і ўкіне ў скрынку з нумарамі. На выбары мусіць ісьці кожны.

Дык ўсе, як адзін, ідзеце і галасуйце за сапраўдны народны беларускі сьпісак № 11.

Беларускі Выбаршчык.

З Беларускага жыцьця.

ПАД ПОЛЬШЧАЙ.

Рэвізія ў сябры Б. Х. Д. Дня 1 г. м. у в. Лапацічы, Баранавіцкага пав., паліцыя зрабіла рэвізію ў сябры Б. Х. Д. Станіслава Татарыновіча. Шукалі нейкіх дакумантаў і аружжа. Не знайшлі нічога.

Прыпамінкі на задушкі. У дзень Задушны, у панядзелак 3 г. м. віленскія беларусы, па прыкладу мінулых гадоў, адведалі могілкі памёршых беларускіх пісьменьнікаў і дзеячоў на магілках Росса ў Вільні.

Б. Тарашкевіч і С. Рак-Міхайлоўскі заграніцай. Польскія газэты падаюць, што б. паслы Тарашкевіч і Рак-Міхайлоўскі выехалі заграніцу, быццам у Нямеччыну. І так, як бачым Луцкевічу і Астроўскаму перацягнуць гэных б. паслоў у свой полёнофільскі лагер не ўдалося.

Суд над Жодзішнымі сьпевакамі — С. Грыбам і М. Ярмаком. Дня 12 г. м. адбудзецца Апэляцыйны суд над жодзішнымі сьпевакамі Грыбам і Ярмаком, якіх Акруж-

ны суд засудзіў: першага на 9 месяцаў, а другога на 4 месяцы ў вастрогу, затое што пяючы беларускія рэлігійныя песьні ў часе працэсіі кругом касьцёла, быццам перашкаджалі Жодзішнаму пробашчу кс. Дровічу адпраўляць набажэнства. Бароніць Грыба і Ярмака адвакат Аляхновіч.

Ком лаянкі Стэповіча і Юхневіча. Быўшыя паслы А. Стэповіч з К. Юхневічам, хочачы прайсьці ў Сойм, пайшлі на выбары ў адным толькі Сьвянцянскім вокрузе, назваўшы сябе „Беларускімі Незалежнымі Радыкаламі." Як толькі даведаліся, што іх сьпісак зацьверджаны і мае № 24, мусіць каб скарэй праскочыць праз соймавы парог на мягкія пасольскія крэслы, выдалі адозву да выбаршчыкаў, якая па зьместу свайму проста ком лаянкі. Ругнуўшы, што называецца, чуць і не самых сябе, паказаўшы, па дэфэнзыўнаму, пальцам на беларускіх ксяндзоў, намахляваўшы, што яны—Стэповіч і Юхневіч, выдалі на беларускія народныя патрэбы з уласных кішанёў 15 тысяч зл., чаго не зрабілі іншыя паслы—заклікаюць выбаршчыкаў галасаваць за іх сьпісак № 24. Але верым, што ахвотнікаў галасаваць за іх ня будзе.

Бязглуздае выясьненьне беларускай санацыі. „Цэнтрасаюз" беларускіх полёнафілаў з-пад № 22 выдаў адозву, ў якой, пахваліўшы сябе і сваіх кандыдатаў, у канцы да дурасьці дэмагагічна выясьняе „саюз" Ярэміча з Стэповічам, каб ўвесьці ў блуд выбаршчыкаў.

Гэтае бязглуздае „выясьненьне" санатараў з пад нумару 22 дакладна пацьвярджае аб „праўдзівасьці" ўсяе іх пісаніны, бо кожнаму ведама, што „Украінскі і Беларускі Выбарны Блёк" № 11 з так зв. „Беларускімі Незалежнымі Радыкаламі" —Стэповічам і Юхневічам, нічога ня мае супольнага.

Словам, беларускія полёнофілы у ілжы перабралі меру.

З РАДАВАЙ БЕЛАРУСІ.

Камуністычны паход проціў Беларускай Акадэміі Навук у Менску. Бальшавіцкая газэта „Правда" падае, што ў Беларускай Акадэміі Навук у Менску камуністычныя ўлады спасьцераглі ня зусім камуністычную работу. Акадэмія Навук, піша „Правда", замест каб стацца цэнтрам „пролетарскай навукі" сталася асяродкам беларускага „нацыянал-дэмократызму". Некаторыя „камуністы" — кіраўнікі Акадэміі, — згаджаліся з „нацыянал-дэмократамі" ў справах культурна-прасьветных пытаньняў. Многія з прац Акэдэміі пашыралі „буржуазна-клерыкальную" ідэолёгію.

За гэтыя „праступкі" ўсе „віноўнікі" выкінуты з Акадэміі і перададзены ў партыйны суд.

Словам, паводле камуністычнай ідэолёгіі Беларуская Акадэмія Навук не павінна быць беларускай, бо мусіць быць пралетарска-інтэрнацыянальнай.

З выбарнага фронту.

Зацьверджаньне беларускага сьпіску № 11 — „Украінскі і Беларускі Выбарны Блёк" у Сойм і Сэнат у Наваградзкім вокрузе. Беларускія газэты падалі, што ў Наваградзкім вокрузе беларускія сьпіскі № 11 ў Сойм і Сэнат скасаваны, аднак у апошнія часы выясьнілася, што сьпіскі гэтыя **зацьверджаны.**

Кандыдаты на сьпіску „Украінскага і Беларускага Выбарнага Блёку" № 11 у Навагрaдчыне: у Сойм: 1. Хадаркевіч Александр, селянін з м. Турца Ярэміцкай гміны, 2. Малец Ян, селянін з м. Ліпнішак Лідзкага пав., 3. Цікота Фэлікс, селянін Вялейскага пав.; у Сэнат на 1 месцы ведамы б. сэнатар Вячэслаў Багдановіч.

Дзяржаўны сьпісак „Украінскага і Беларускага Выбарнага Блёку № 11. Па дзяржаўным сьпіску „Украінскага і Беларускага Выбарнага Блёку № 11 кандыдуюць у Сойм: 1. др. Д. Левіцкі — украінец, 2. М. Матчак — украінец, 3. Ф, Ярэміч — беларус, 4. С. Хруцкі — украінец, 5. В. Мудры — украінец і інш.

Каб з дзяржаўнага сьпіску правесьці аднаго пасла, трэба, каб наймени у 6 вокругах гэты сьпісак правёў хоць па адным паслу.

Дзеля таго, што сьпісак „Украінскага і Беларускага Выбарнага Блёку" № 11 зацьверджаны ў 14 вокругах (11 вокругаў украінскіх і 3 беларускія) і калі-б з гэтых 14 вокругаў прайшло 18 паслоў з дзяржаўнага сьпіску, тады пройдзе наймени 3 паслоў.

З ВЫБАРНАГА ФРОНТУ Ў ЗАХ. УКРАІНЕ.

Зацьверджаныя і ўняважненыя сьпіскі „Украінскага і Беларускага Выбарнага Блёку" № 11. Сьпіскі ўкраінскіх кандыдатаў „Украінскага і Беларускага Выбарнага Блёку" № 11 зацьверджаны ў 11 украінскіх вокругах — 8 у Галічыне і 3 на Валыні. Скасаваны ў 5-ці вокругах (у гэтым ліку ў адным вокрузе ўкраінска-беларускім — у Пінску).

Гутарка дзядзькі Мацея з кумам Пранукам аб выбарах.

— Ну і што, кум Мацей, ізноў маем выбары? Ці ня часта яны? Ведаеш кум, ужо надаела выбіраючы, а паправы ніякай ня відаць! — гэтак гаварыў Пранук, спаткаўшыся ў мястэчку з сваім кумам Мацеям, якога ўсе знаёмыя празывалі „Дзядзька Мацей".

— А ты думаеш кум, што на гэтых выбарах будзе канец — адказаў Мацей, — ты глядзі, сколькі разоў мы выбіралі ўжо солтыса, або войта, а яшчэ сколькі разоў будзем выбіраць. Яно-ж праўда, што часам і надакучаць гэтыя выбары, але што ты зробіш? Раз адклікаюцца да волі народу, дык трэба гэту волю паказаць, каб потым не дакаралі, што вось мы вам давалі магчымасьць падаць свой голас, але вы маўчалі. А калі маўчалі, то маўчыце і цяпер, а мы будзем рабіць, што захочам. — Што-ж яны могуць зрабіць?

Усё. І падаткі пабольшыць і штрафы новыя прыпісаць і новыя законы выдаць аб асадніцтве — ўсё, што захочаць.

— Няхай іх немач — і так ужо вялікія падаткі, ды й асаднікаў многа і штрафаў хоць адбаўляй, — нашто-ж яшчэ большыя? Лепш было-б, каб зьменшылі!

— А хто-ж табе зьменшыць, калі ты ня хочаш ісьці галасаваць? Ты думаеш, што да цябе ў хату прыдуць пытацца, што маюць рабіць? Будуць пытацца паслоў, а што паслы скажуць, тое будуць рабіць...

— Хто там будзе іх пытацца — перабіў Пранук, цяпер усе паслы сядзяць, а Пілсудзкі што захоча, тое і зробіць.

— Ня надта — адказаў Мацей — глядзі, сам Пілсудзкі ідзе ў Сойм, дык мусіць Сойм мае вялікую сілу і на нешта патрэбен.

— Ось як! Дык мусіць і праўда, што Сойм на нешта патрэбен. Але скажы, кум, на каго галасаваць, на палякоў ці на беларусаў.

— А ты хто, паляк ці беларус?

— Ясна, што беларус!

— Ну дык і галасуй на беларусаў. Хто-ж гэта чуў, каб галасаваць на чужых!

— На беларусаў то на беларусаў, але якіх? Бо як сам ведаеш, шмат цяпер рожных беларусаў натварылася.

— На чэсных і ведамых беларусаў; ясна, што не на рожных прайдзісьветаў, аб якіх і ня чуваць было прад выбарамі, а цяпер толькі вылезьлі яны, як барсукі з нораў — і давай ім галасы.

Зноў у справе лемантара Любіч-Маеўскага.

Нашы чытачы хіба помняць, як у прошлым годзе ўсё беларускае грамадзянства пратэставала проціў выданага польскім дзяржаўным выдавецтвам беларускага лемантара Любіч-Маеўскага. Лемантар гэты быў настолькі няўдалы з боку пэдагогічнага і тэхнічнага, што самі ўлады пастанавілі выняць з прадажы і ня ўвадзіць у школы. Доўга гэты лемантар хадзіў па руках беларускай віленскай санацыі і ўрэшце быў „папраўлены": Увялі замест польскага „sz" і „cz" беларускае „š" і „č", выкінулі ўсе нясінецыцы і недахопы з боку пэдагогічнага, папраўілі граматычныя памылкі — і вось мы ўжо маем новае папраўленае выданьне гэтага лемантара. Друкаваны ён таксама лацінкай, як і той першы. Распараджэньнем Мініст. Асьветы з дн. 8.VII. с. г. гэты лемантар уводзіцца ва ўсе беларускія пачатковыя школы.

Але гэтае распараджэньне міністэрства ня ёсьць простым распараджэньнем, якое можа прайсьці бясьледна ў беларускім жыцьці. Тое распараджэньне мае ў сабе такія мэты, што аб іх варта пагаварыць шырэй.

Вось-жа ў гэны лемантар, друкаваны лацінкай, укладаецца дадатак, друкаваны гражданкай. Гэты дадатак, абымаючы ў сабе гражданскую абэцэду, праваслаўныя малітвы і некалькі чытанак, празначаны толькі для праваслаўных. Каталіцкае дзіця пад строгай адказнасьцю вучыцеля пры сваім лемантару гэтакага дадатку мець ня можа. Мала гэтага — гэты дадатак можа быць уведзены толькі ў тых школах, дзе ёсьць большасьць праваслаўных дзяцей, а дзе іх меншасьць, то нават праваслаўным дзецям гэтага дадатку даваць ня можна, яны павінны вучыцца з лемантара друкаванага лацінкай!

З гэтага распараджэньня міністэрскага выплываюць дзьве рэчы: 1) далейшае паглыбленьне падзелу і пропасьці паміж беларусамі каталікамі і праваслаўнымі і 2) імкненьне да шыбчэйшага спалянізаваньня праваслаўных там, дзе яны знаходзяцца ў меншасьці пасярод каталікоў. Для нас ясна, што ўрад хоча зусім вывесьці гражданку з грамадзкага жыцьця там, дзе ёсьць праваслаўныя ў меншасьці, а ў меншасьці яны бліжэй этнаграфічнай Польшчы... Значыць, адсоўваючы ўжываньне гражданкі далей на ўсход, польская палітыка думае гэтак-жа далёка пасунуць полёнізацыю „крэсаў"...

Мы ў прынцыпе не зьяўляемся праціўнікамі лацінкі. Ужо здаўных мы стаім на тым становішчы, што лацінка ёсьць такім самым беларускім шрыфтам, як і гражданка. Абедзьве абэцэды маюць у нас поўныя правы. Аднак мы заўсёды цьвердзілі, што **ў імя еднасьці Беларускага народу нам патрэбны два шрыфты: і гражданка і лацінка.** Калі на ўсходзе будуць доўга яшчэ ўжываць гражданку, а тут у нас лацінку, мы баімся, каб наш народ ня быў падзелены на дзьве часьці, так як сэрбы і харваты. Урэшце нашым старадаўным, гістарычным шрыфтам ёсьць гражданка, мы яе ня можам адкінуць, так як ня можам адкінуць слаўнае мінуушчыны.

Затым мы і стаім за гражданку, як за наш гістарычны шрыфт і стаім таксама за лацінку, як за сучасны шрыфт усіх культурных народаў.

Практычна падходзячы да справы мы будзем заўсёды дамагацца, **каб чытанкі ў школах былі друкаваны і лацінкай і гражданкай,** каб дзеці, скончыўшы школу, маглі прачытаць кніжку або газэту друкаваную і лацінкай і гражданкай. Гэта зусім магчыма, як нам паказвае практыка у немцаў: там усе школьныя чытанкі друкуюцца і готыкай і лацінкай у перамешку. Калі-б польскі ўрад гэтага зрабіць не хацеў, але ў імя сваіх палітычных мэтаў далей праводзіў свае пляны, мы будзем прымушаны ўсімі сіламі проціў гэтага пратэставаць і пры ўсякай нагодзе вучыць наш народ і гражданкі нараўне з лацінкай. З гэтай мэтай мы выдаём ужо блізка год „Б. Крыніцу" ня толькі лацінкай але і гражданкай, мы будзем яе выдаваць і надалей гэтак і разам з гэтым будзем пільна сачыць за ўсімі падходамі польскага ўраду да справы гражданкі. Далейшыя выдавецтвы беларускіх чытанак для старэйшых аддзелаў пакажуць, ці нашыя пажаданьні ўрад узяў пад увагу ці не. Калі-б аказалася, што чытанкі выпушчаны толькі лацінкай, мы будзем прымушаны рашуча бараніць нашае цяперашняе становішча ў справе шрыфтаў. Мы ў газэтах і кніжках, друкаваных лацінкай, будзем удзяляць месца і гражданцы, каб такім парадкам знаёміць наш народ ня толькі з лацінкай, але і гражданкай. І будзем рабіць гэта ў імя вялікай ідэі: **еднасьці Беларускага народу.**

Браты Беларусы! Памятайце, што ў еднасьці сіла. Дык не разцярушчывайце еднасьці і ўсе, як адзін, мужчыны і жанчыны ў дзень 16 лістапада ў Сойм і ў дзень 23 лістапада ў Сэнат галасуйце за № 11.

— Ну добра, а вось глядзі, нейкі „Цэнтрасаюз" знашоўся, там ізноў Стэповіч з Юхневічам пруцца на вёску па мандат, а там і яшчэ і яшчэ, ну і згадай на каго галасаваць!?

— Ну і дзіўны ты Пранук! А ці ты чуў прад выбарамі пра нейкі „Цэнтрасаюз"? Ня чуў? Ну дык і знай, што гэта зроблена штука толькі на выбары, пройдуць выбары і канюк — няма „Цэнтрасаюзу". А ці ведаеш хто ў гэтым „Цэнтрасаюзе" працуе?

— Луцкевіч і Астроўскі.

— А ці ведаеш, хто такі Луцкевіч і Астроўскі?

— Як-жа ня ведаю? — ведаю! Аб іх уся Беларусь ведае і ня хваліць іхных палітычных выкрунтасаў. Але ў іх ёсьць яшчэ нейкі Акінчыц!

— А ці ты чуў, хто такі Акінчыц?

— Не, ня чуў.

— А ці ты знаеш Саўку, што памагае Гіршку прадаваць тавар на боты?

— Як-жа-ж ня знаць, яго ўсе знаюць. Стане на рынку прад Гіршкавай крамай і крычыць да баб: „Марыся, за боты бярыся! Добры тавар!"

— Ну во, во, гэтак сама і Акінчыц перад крамкай Луцкевіча і Астроўскага, якая завецца „Цэнтрасаюзам".

— Ах, вось як; ну не, на „Цэнтрасаюз" то я галасаваць ня буду. І на Стэповіча і Юхневіча таксама ня буду, бо гэта гультаі, мы ўжо праканаліся, хто яны такія. І на Пімонова ня буду, бо ён мільянэр, не роўня нашаму брату. У яго двароў шмат, а ў Вільні дамоў скольні! Не заступіцца ён за нашага брата. Ведаеш што, Мацей, калі ўжо галасаваць, дык найлепш на 11 нумар, там свае людзі стаяць. Напрыклад такі інжынер Клімовіч. Яго пісаньне аб гаспадарцы, што друкуецца ў „Б. Крыніцы" я заўсёды прачытаю і многа карыстаю. А калі будзе паслом, дык часьцей сам прыедзе і на месцы парадзіць. Або такі доктар Грынкевіч; ягоныя творы мне надта спадабаліся. А Багдановіч, а Рагуля, што сядзяць у турме, і ўсе іншыя. Глядзі скольні вароду...

— Ну вось, урэшце дайшоў да розуму мой Пранук. Ведаеш што, Пранук, я даўно праканаўся, што няма лепшага нумару за 11-ты, затым і я думаю за яго галасаваць і каля нас усе рашылі паддзяржаць нумар 11.

— Толькі нумароў у мяне няма і ня ведаю, дзе дастаць?

— Глупства нумаркі, купі за 5 грошай аркуш чыстай паперы, парэж яе на роўныя картачкі, напішы на кожнай картачцы лічбу 11 — вось і будуць нумаркі для сябе і для суседзяў. Толькі глядзі, каб болей нічога ня пісаць на гэтай картачцы, апроч лічбы 11, нават кропкі ня стаў, бо гатовы ўняважніць твой голас.

— Добра, добра, усё зраблю, што трэба і яшчэ другіх навучу. Бывай здароў, Мацей.

— Бывай здароў, Пранук.

Д.

Аб гаспадарцы.

Галодная карова каштуе найбольш і дае найменш.

Восень у земляробскай гаспадарцы гэта час, калі трэба і можна зьвярнуць узноў больш увагі на гадоўлю жывёлы наагул а скаціны асабліва. Тут месьціцца шмат грахоў і грашкоў, якія трэба абавязкава з каранём вырваць, калі хацець, каб сягоньня гаспадарка аплачывалася. Возьмем хоць-бы гадоўлю каровы.

Звычайна ў нас — і ня толькі ў нас — так бывае, што гаспадар, а найчасьцей гаспадыня „з бядой папалам" дбае яшчэ аб карове, пакуль бачыць з яе в і д а в о ч н у ю карысьць: як лепш накорміць, ці напасе карову, то і больш дастане з яе малака, а як накарміць „забудзецца", ці пагода на пасьбішчы сапсуецца, дык і з малаком разьвітайся.

Не заўсёды аднак так бывае, што карова адразу і так відавочна дае знаць аб недахопах кармленьня; а бывае навет і так, што раздоеная карова быццам стрымацца ня можа. Калі і як гэта бывае і якія бываюць з гэтага насьледкі?

Перадусім калі карова ц е л ь н а я. Растучы у сярэдзіне плод (цялё) патрэбуе што раз больш і больш кармавінаў (пашы), якія бярэ з матчынай крыві. Значыць цельная карова мусіць аддаць з сваей крыві ношанаму цяляці тымбольш спажыўных сустак, чым цельнасьць ейная становіцца „вышэйшай", чым больш прыбліжаецца час цяленьня. А чым больш карова мусіць аддаць, тымбольш мусіць і прыняць у сябе. Здавалася-б, што рэч так ясная і не патрабуе тлумачэньняў. Тымчасам у практычным жыцьці дзеіцца часта—густа якраз наадварот. Чаму? Бо недазнаны „розум гаспадарскі" ўважае, што калі высокацельная карова зарывае, не дае малака, дык і не патрабуе гэтульні, колькі дагэтуль корму. Жыцьцё аднак не стаіць на мейсцы. Усё жывое — жыве, расьце, а тымсамым і мусіць есьці. Растучае цялё-плод таксама есьць. Але што? Ні больш ні менш, як матчына мяса. Так, матчына мяса! Гэта сьцьвердзіла навука. Пэўне-ж, што цялё ня есьць мяса, як такога, яно высысае кроў. Але гэта „тое на тое выходзе", карова відавочна траціць на вазе, а найчасьцей і на здароўі. З хворай-жа каровы добрай дойкі ня будзе, а з цяляці гэтак зродженага таксама цяжка спадзеіцца нечага добрага.

Мала таго. Схудаўшая гэтак на карысьць цяляці карова па ацяленьні „страчанае мяса" вярнуць сабе мусіць. Інакш бы жыць не магла. Але кошты рэстытуцыі (папраўкі, павароту да стану папярэдняга) неараўнана большыя, чымся вартасьць „заашчаджанага" корму на карове цельнай. Гэты „барыш" плаціць гаспадар.

Жывое каровяе мяса бывае ня толькі дарагім кормам для цялячага плоду, але йшчэ даражэйшым матэрыялам для выраблення малака. Здараецца гэта асабліва ў вельмі добрых доек, якія ў час дойнасьці каб і хацелі, дык ня могуць стрымацца вырабляць вялікае мноства малака. Патрабуюць на гэта шмат і добрага корму. А як гэтага не дастануць, дык працуюць коштам уласнага жывога цела — пэўне-ж, да пэўных граніцаў,—але малако вытвараць мусяць.

Нешта падобнае бывае і пры каровах, асабліва позна зарываючых. Згэтуль высновак, што калі нехта ўздабыўся на добрую карову, дык мусіць мець і чым яе карміць. Інакш такая карова, як-га зарве, і замест спадзяванай карысьці прынясе толькі страты (высокія кошты набыцьця, а карысьці ні чуць ня большая, а найчасьцей і меншая, чымся ад каровы звычайнай).

(Паводле інж. Ад. Клімовіча).

Да нас пішуць.

12 СЬПІСКАЎ КАНДЫДАТАЎ У СОЙМ.

Сьвянцяншчына. Ужо аб'яўлены зацьверджаныя сьпіскі кандыдатаў у Сойм. У мястэчках і вёсках, дзе паняшчаюцца абвадовыя выбарныя камісіі, расплякатаваныя ўсе сьпіскі. Сьпіскаў усіх налічаецца аж 12.

На першым мейсцы сьпісак ББ. № 1. Гэты сьпісак, ці лепш сказаць яго агітатары, спадзяецца забраць у Сьвянцянскім вокрузе чуць ня ўсе 6 мандатаў. Апэтыты ў іх на мандаты вялікія, але яны ня пэўны, што сяляне накормяць іх прагавітасьць сваімі галасамі.

Далей ідуць сьпіскі розна-калёрных партыяў польскіх; на чале іх стаіць „Цэнтралеўз" № 7—саюз польскага Пяста, Вызваленьня, П.П.С, Строніцтва Хлопскага. Гэты сьпісак таксама думае яшчэ пацягнуць з пару мандатаў, але гэта так-жа толькі апэтыт прагавітасьці, бо галасаваць беларуская вёска на „Цэнтралеў" хіба што ня будзе.

Пасьля гэтых двух сьпіскаў ідуць па мандаты ў Сьвянцяншчыне і польскія „слаўныя" эндэкі № 4. Але гэтыя паны так ужо

Выраж гэтыя нумары кожны паасобку і галасуй імі 16-га і 23 лістапада. Нумар з якімкольвек дапіскам, знакам хоцьбы на адваротнай старане—будзе няважны. Дык глядзі, каб нумар быў чысты.

11

11

11

11

11

ведамы беларускім выбаршчыкам, што мусіць цяпер ніхто ўжо на іх сьпісак галасаваць ня будзе.

Апрача гэтых сьпіскаў выразна польскага характару, стаяць сьпіскі жыдоўскія і далей дзеля разьбіваньня галасоў, мяйсцовыя сьпіскі г. зв. лёкальныя, прыкладам сьпісак Галкі і Адамовіча, а так-жа з „мяйсцовай“ і белалускай ахварбоўкай — Польска-беларуская Еднасьць Людовая, Цэнтрасаюз беларускіх полёнафілаў і сьпісак Беларусхіх „Незалежных Радыкалаў“ Стэповіча і Юхневіча.

Найбольш сьмешны з сьмешных сьпіскаў дык гэта сьпісак „Беларускіх Незалежных Радыкалаў“ № 24 Стэповіча і Юхневіча. Вельмі слушна назваў іх „Беларускі Кліч“ паўзунамі ла поўнага карыта. Паўнеж, ніхто з Беларусаў на іх голасу ня дасьць. Сьпісак „Цэнтрасаюзу“ № 22 спадзявацца на карысны вынік выбараў для сябе ня можа, бо на гэты сьпісак № 22 хіба буцуць галасаваць толькі тыя, хто яго ня знае, але на нясьведамасьць выбаршчыкаў цяпер разьлічаць ня прыходзіцца. З беларускіх сьпіскаў, на якія буцуць галасаваць у Сьвянцянскім вокрузе, дык гэта сьпісак „Беларуска-Украінскага Выбарнага Блёку“ № 11.

І сапраўды, гэты сьпісак ёсьць адзіным сьпіскам у Сьвянцяншчыне, за які ўсе Беларусы будуць галасаваць.

Выбаршчык.

З Вільні.

Зьезд Літоўскага Навуковага Т-ва адбыўся 1. і 2. лістапада с. г. пры учасьці каля 300 людзей з Віленшчыны і заграніцы. Быў на гэтым зьезьдзе і прачытаў вельмі глыбокія па сваей думцы рэфэраты Нэстор сучасных літоўскіх філёзофаў Відунас з Тыльжы (у Нямеччыне). Апрача гэтага чыталі рэфэраты: гр. гр. Каразія, Кс. Віскант, Л. Абрамовіч, Вілейшыс і Кайрюкштіс. Урад Т-ва выйшаў з перавыбараў у складзе нязьмененым: Шыкшніс, Др. Альсэйка, Каразія, Др. Шляпэліс, Унтуліс, Матёшайтіс і Юхневіч.

Ападаючае лісьце.

(Фельетон).

Восень. Смутны і шэры час, грамадзяне. На зямлі мокра. З гары лье. Як не хавайся чалавеча ў каўнер сваей пацёртае вопраткі, ніяк не схаваешся. Брр... як ня прыемна! Добра, калі яшчэ абутак цэлы маеш, дык яшчэ туды-сюды, яшчэ жыць можна, хоць ногі сухія маеш.

Праўда, слухачы шаноўныя!

А як не... тады што? Дрэнныя справы, адкажаце. І сапраўды дрэнь дзела. Я гэта добра ведаю.

А яшчэ і лісьцё гэтае, мокрае, шэрае з жоўтым адценкам кружыцца і кружыцца ў паветры, аж прыкра робіцца.

Думкі нейкія дрэнныя ў галаву лезуць, а ну гэтакі мокры ліст на нос зваліцца. Ну і абутак непакоіць, а як раптам ужо дзірка ёсьць, бо што дзіўнага, дзіркі сяньня рэч модная, поўна іх усюды, дзе ні глянь, — і ў адзежы, і ў абутку і ў кішані, і ў буджэце, ня толькі ў маім, а нават у дзяржаўным.

Прыкрая рэч гэта дзірка, грамадзяне, страшна яна чалавека дэнэрвуе ўжо. Дзірка, здаецца, самая нявінная, як тая панначка, а столькі думак прыкрых.

Але што рабіць? Агульны крызыс, страшны гаспадарчы крызыс, кажуць, гэтаму прычынай — і безрабоцьце і беззямельле, і безграшоўе, і іншыя бязладзьдзя, а за імі, як цень, дзірка, страшная дзірка.

А лісьцё падае і падае. Кружыцца, як абалдзелае ад агульнага безталкоўя. На зямлі мокра, балота, а з гары лье...

Але даруйце, грамадзяне, што я так доўга аб лісьцёх, дзірках і ўсялякага роду няцікавых рэчах гутарку завёў, але надта ўжо, як кажуць, актуальныя яны.

Але давайце аб больш цікавых штуках пагутарым, я прызнацца якраз хацеў гутарку з вамі ўзвесьці на такія пекныя кавалкі, як выбары, агітатары, адозвы і таму падобныя рэчы.

Бо аб выбарах цяпер і дождж ліе і іншыя вераб'і на дахох цьвіркаюць. Выбары... выбары!.. Падумаеш, якая важная рэч!.. Але ў запраўднасьці ціха яшчэ.

Яшчэ мала руху, мала шуму ёсьць, ня так як прад выбарамі.

Але гэтак падобна прад бураю бывае. Ну а пакуль што ціха, дык я карыстаючы аб дажджу, лісьцёх і дзірках разводжуся.

Але кажуць, што можа быць бура, дзьмухне гэтак і разам палятуць з ападаючымі лісьцямі на вас, слухачы мае паважаныя, лісты, лістовачкі, ліскі, лісточкі, паперкі, білкі рожныя.

Аааяяяя яй! Мой тавар лепшы, налятай, рабяткі, купляй!

Закіпяць нашыя мястэчкі, рыначкі, пляцыкі, палятуць гэтыя крыкі і з вазоў і з бочак і з карчоў усялякіх.

Людзі зьявяцца, агітатары ўсялякія. Налятай, купляй, пятачок пана!

І скуль, скуль толькі возьмуцца? Усё роўна, як з неба зваляцца, як той мокры ліст—проста табе чалавеча на нос. І дзе былі дагэтуль?

Падобна кажуць у Сойме сядзелі. Часам аж шкада іх зробіцца. Ці ня маюць яны прыпадкам дзірак у ботах, бо мокра цяпер неяк.

Але дзе там! Яны, ведаеце, якраз радзіць вам будуць, як дзіркі латаць, ня толькі радзіць, але і самі залатаць прыабяцаюць.

І зьдзівішся, чалавеча, скуль вось у іх такая любоў да роду людзкога, а тым больш да мужыка - беларуса.

І скуль іх ліха не нанясе, гэтых паноў і поўпанкоў, і скуль яны ня возьмуцца палячкі гэтыя і таўстыя і тонкія і нізкія і высокія.

А назовы сабе якія папрыдумываюць, аж ліха чалавека бярэ і „хлопы“ і „эндэкі, бэбэкі і вызваленцы і пясты і цэнтраправы і левы і пэпээсы і іншыя. Аяяяя—яй! Налятай, братцы, купляй! Пятачок пана.

Любоў, знача, да народу Беларускага. Але мы ўжо ня дурныя, старога вераб'я на мякіне не правядзеш!

Навучылі нас прайдзісьветы гэтыя. Ужо колькі разоў бывала паслухаеш, падумаеш і галасьнеш на якога прахвоста пэпээса, эндэка, бэбэха, вызваленца „хлопа“ ці іншага, а ну думаеш і ўпраўдзе мо' дажджу ня будзе і дзіркі залатаюцца, бо надта ўжо яны хораша абяцаюць, кажуць, што як толькі паслямі будуць, дык падобна і восені ня будзе, а чалавек сабе сыта, суха і цёпла жыць будзе.

Але цяпер, браце, ня тут та было, за рубель нас ня возьмеш. Мая жонка, ужо качаргу, ці памяло якое ці што там іншае на галовы рожных агітатараў прыгатавала.

Ня пушчу, кажа, у хату агітатараў гэтых, бо яшчэ горы залатыя абяцаючы яйкі, ці гаршчок які сапруць, ад іх усяго спадзявацца можна. А яна ў мяне, праўду кажучы, баба разумная.

Мо і мае рацыю. Быццам у нас сваіх людзей і сьпіску няма?

Ёсьць! што там і казаць, гэта кожны з нас сам ведае.

Ведаем, што Беларусы ўсе галасуюць за № 11.

А покі што вось дождж і дождж, іш заўзяўся, хрэн яму ў вочы, дробненькі гэтакі сячэ і сячэ, а вераб'і напушаныя па даху скачуць і ўсё цьвіркаюць: вы-бары... выбары... агі-та-тары... цьвік... цьвір... цьвір...

А з гары лье, а на зямлі мокра, балота, а боты з дзіркамі, як у каўнер не хавайся—ўсёроўна дождж дастане.

І лісты кружацца і кружацца мокрыя, зімныя, шэра-жоўтыя. Усё-ж такі няпрыемная пара гэта восень, грамадзяне!

Вільня, кастрычнік 1930 г.

Іксоўскі.

Куток сьмеху.

Жарты — няжарты.

Модныя, ці лепш „мадзеючыя радыкалы“ (былыя паслы А. Стэповіч і Юхневіч) уздабыліся на „вялікую працу“: выдалі анагдай выбарную адозву, у якой між інш. хлусьні і дэмагогічнага пусканьня дыму ў вочы нясьведамым людзям кажуць, што яны выдалі на беларускія справы(!) аж 15 тыс. зл.

Панове кабінэтныя Радыкалы! Калі Вы дакажаце, што хоць дзесятую часьць паказанай сумы Вы дабравольна і асабіста безкарысна выдалі на беларускія справы, дык Беларусы дадуць Вам дажывотны мандат, за каторы, як цяпер хіба толькі праканаліся, усё-ж трэба папрацаваць.

Дакажэце! рп.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны Вільня, Выдавец Янка Шутовіч